Літаратура:

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі у 6 т. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1996. – Т. 3. – С. 125;
Энциклопедический словарь. Т. 9; Издатели: Ф. Брокгауз. И. Ефрон. – СПб. – 1893. С. 749.
2. Кімель, Я. Яўрэйскае гарадское насельніцтва Беларусі ў 1897 – 1926 гг./ Я. Кімель // Беларусіка. Кн. 4. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 90
3. Иоффе, Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси/ Э.Г. Иоффе. – Мінск, 1996. – С. 60.
4. Функ, Ю.В. Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX в./ Ю.В. Функ. – Мінск: Бел НИИ ДАД, 1998 – С.70.
5. Иоффе, Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси/ Э.Г. Иоффе. – Мінск, 1996. – С. 52
6. Сборник материалов об экономическом положении евреев в России. Т. II. СПб., 1904. – С. 13; 36; 56; 64; 103.
7. Энциклопедический словарь. Т. 9; Издатели: Ф. Брокгауз. И. Ефрон. – СПб., 1893. – С. 750.
8. Еврейская питейная торговля в России. – СПб.,1886. – С. 5; 10; 13; 17; 19.
9. Функ, Ю.В. Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX в./ Ю.В. Функ. – Мінск: Бел НИИ ДАД, 1998. – С.74
10. Сборник материалов об экономическом положении евреев в России. Т. II. СПб., 1904. – Стр.95
11. Энциклопедический словарь. Т. 9; Издатели: Ф. Брокгауз. И. Ефрон. – СПб. – 1893. С. 749.
12. Сборник материалов об экономическом положении евреев в России. Т. II. СПб., 1904. – С.246; 260; 261; Еврейская энциклопедия. – Т. 6. – С. 798; Функ Ю.В. Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX в. Мн.: Бел НИИ ДАД. 1998. – С.85.

СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ СЕЛЬСКІХ І ВАЛАСНЫХ ПАЗЫКА-ДАПАМОЖНЫХ КАС І МІРСКІХ ПАЗЫКАВЫХ КАПІТАЛАЎ

С.А. Талмачова
БДПУ (Мінск)

Развіццё капіталістычных адносін патрабавала ўдасканалення апрацоўкі глебы, паляпшэння насеннага фонду і пароды скаціны. Усё гэта для большасці сялянства было немагчыма без дадатковага фінансавання. Аднак тыя формы крэдыту, якія прадстаўлялі банкі, не адпавядалі інтарэсам сялянства. Таму па загаду сялянскіх устаноў на падставе арт. 186 "Агульнага палажэння" ў валасцях ствараліся пазыка-дапаможныя касы [1, № 36657]. Закон даў права сельскім грамадам, дзе існавалі ці арганізаваліся гэтыя капіталы, вырашаць спосабы складання і парадак карыстання. Звычайна складаліся гэтыя касы з рэшткаў ад расходавання сабраных на розныя патрэбы мірскіх сум, а таксама са штрафаў, якія прысуджаліся валаснымі судамі, старшынямі і старастамі. Здаралася, што сялянам былыя памешчыкі дарылі грошы. Так, у Ігнаціцкай сельскай грамадзе Самахвалавіцкай вол. у 1864 г. быў пастаянны капітал у памеры 308 руб. 2 кап., падараваны памешчыкам Ельскім [2, л. 15 зв.–16]. У 1867 г. міравы пасрэднік Навагрудскага павета дакладаў губернатару, што ведамасці дапаможных кас вяліся заблытана, няправільна, грошы выдаваліся ў пазыку і не вярталіся. Часам у спецыяльных кнігах не паказвалася, чаму і на якой падставе адбывалася гэтая выдача [3, л. 12 зв.].

У многіх валасцях у першай палове 60-х гг. XIX ст. запасных капіталаў не было, у іншых даходзілі да 600 руб. Памеры іх залежалі ад дабрабыту сялян і колькасці душ у воласці [2, л. 24, 53]. У 1866 г. Мінскі губернатар адзначаў, што запасныя капіталы ў валасцях сустракаліся як "шчаслівае выключэнне" [4, л. 12]. Ужо ў канцы XIX ст. спецыяльныя капіталы меліся амаль у кожнай воласці і азначалася назвай мэты збору. Яны складаліся на лабудову цэркваў, валасных і сельскіх грамадскіх будынкаў, валасных праўленняў, хлебных магазінаў, народных вучылішчаў. Сумы часта даходзілі да некалькіх тысяч рублёў, дзесяці і нават болей, і збіраліся на працягу некалькіх гадоў – ад трох да дзесяці і болей [5, л. 270–271 зв.; 6, с. 59–60]. Напрыклад, у Віленскай губ. існавалі наступныя спецыяльныя капіталы: 1) вучылішчны капітал, які ствараўся з узносу (1,5–2 кап. з дзесяціны), устаноўленага цыркулярам М. М. Мураўёва ад 23 снежня 1864 г. № 4203 і які ішоў на некаторыя выдаткі па народных вучылішчах; 2) мірскі дапаможны капітал, што складаўся са штрафных грошай, і які выдаваўся сялянам у пазыку з 6% гадавых; 3) сіроцкі капітал, што складаўся з укладаў, якія належалі сіротам і заставаліся без руху, і толькі часткова даваўся ў пазыку сялянам. Віленская губернская па сялянскіх справах установа адзначала, што кантролю за захаваннем гэтых капіталаў і правільным распараджэннем імі не было, таму што не існавала дакладных пастаноў і законаў у адносінах да азначанага пытання [7, с. 733–734].

У Гродзенскай губ. не было сельскіх мірскіх капіталаў, але існавалі валасныя пазыкавыя капіталы, за расходаванне якіх пад назіраннем валаснога сходу адказвалі валасныя праўленні. Пазыкавы капітал даваўся сялянам, якім неабходна была дапамога, а падзесяцінны збор ішоў на патрэбы вучылішчаў. На расходаванне апошняга кожны раз патрабавалася дазваленне дырэкцыі народных вучылішчаў. Пазыкавы капітал выдаваўся сялянам на розны тэрмін, але не больш як на 10 год пад працэнты, якія ўсталёваліся валаснымі сходамі. Часам гэты капітал расходаваўся незваротна на іншыя грамадскія патрэбы: будоўлю валасных праўленняў і інш. [8, с. 58; 6, с. 740].

Гродзенская губернская нарада прадвадзіцеляў дваранства і міравых пасрэднікаў у 1899 г. адзначала, што надзея на атрыманне пазыкі з валаснога капіталу была вельмі малой. Капіталы гэтыя былі нязначныя і ў большасці валасцей наяўных грошай не мелася, таму што ўсе свабодныя сумы былі раздадзены сялянам, якія вельмі неахвотна вярталі гэтыя пазыкі. Крэдытаванне сялян з мірскіх пазыка-ашчадных кас праходзіла па-рознаму нават у валасцях аднаго павета. У Гродзенскай губ. пазыкі часцей даваліся без паручыцельства за пазычальніка з боку благанадзейных гаспадароў, не былі дакладна азначаны правы паручыцеляў па сысканню грошай з няспраўных плацельшчыкаў, а таксама працэдура азначэння ступені неабходнасці ў пазыцы [8, с. 58].

У Мінскай губ. у канцы XIX ст. існаваў мірскі запасны капітал, які належаў усім валасцям губерні і ўтварыўся з запаснога капіталу былых дзяржаўных сялян, са штогадовых рэшткаў мірскога збору на валасныя расходы і штрафаў, што накладаліся былымі міравымі пасрэднікамі і павятовымі ўстановамі на службовых асоб, а таксама прысуджаўся валаснымі судамі. У 1884 г. гэты капітал складаў па ўсіх валасцях губерні суму ў 250 тыс. руб., пры гэтым валасныя праўленні выдавалі з яго каротказтэрміновыя пазыкі, але без вядзення дакладнай справаздачнасці спагнання працэнтаў. Мінская губернская па сялянскіх справах установа зацвердзіла 15 чэрвеня 1884 г. інструкцыю аб парадку карыстання пазыкамі з мірскіх запасных капіталаў і аб парадку вядзення па гэтым капітале справаздачнасці. Прымяненне гэтай інструкцыі дало свае вынікі. Сяляне выконвалі ўмовы каротказтэрміновага крэдыту, і капітал папаўняўся з вышэйазначаных сродкаў, пазыка выдавалася пад 6% гадавых, за несвоечасовыае вяртанне грошай спаганялася пеня [5, л. 65 зв.–66; 7, с. 475]. Аднак Слуцкая павятовая па сялянскіх справах установа адзначала, што рэалізацыя гэтай інструкцыі на практыцы сустракала шмат цяжкасцей і нават часам не выконвалася, таму што вяртанне пазыкі на працягу аднаго года часта было немагчыма, асабліва ў выпадку неўраджаю ці набыцця зямлі ці прылад і прыстасаванняў, якія акупляліся ў доўгі тэрмін [5, л. 95–95 зв.]. У Бабруйскім павеце 1 чэрвеня 1894 г. мірскі запасны капітал складаў 48796 руб. 24 кап., а ў Рэчыцкім мірскія запасныя капіталы ў кожнай воласці складалі ад 2000 да 8600 і правяраліся штомесячна службовымі асобамі валаснога праўлення, праз 6 месяцаў – валаснымі сходамі [5, л. 132–132 зв., 271]. Да 1897 г. запасныя капіталы сялян у Мінскай губ. складалі 552 тыс. руб., з якіх больш за 400 тыс. руб. пастаянна знаходзілася ў народным крэдыце. Гэты капітал належаў у адзаведнай суме кожнай воласці і захоўваўся ў валасных праўленнях успецыяльных скрынях, а 4/5 яго знаходзілася ў карыстанні [5, л. 270–271 зв.; 7, с. 475].

У Магілёўскай губ. таксама існавалі пазыка-ашчадныя касы. У 1884 г. велічыня абаротнага капіталу ўсіх сялянскіх пазыка-ашчадных кас Магілёўскай губ. складала 340 721,5 руб., а ў наяўнасці было 63 389,3 руб. (18,6%) [9, с. 16; 10, с. 323], а ў пачатку 1895 г. увесь капітал складаў 1 103 309 руб. У 1899 г. пазыка-ашчадныя касы былі ўжо ў кожнай воласці губерні, а ў Гомельскім павеце працаваў Нікалаеўскі сельскі банк. Іх агульныя абароты дасягалі 1,5 мільёна руб. Акрамя таго, у ашчадных касах Дзяржаўнага банка ўклады сялян губерні ў 1899 г. дасягнулі 1 757 000 руб. [11, л. 78]. Пазыка-ашчадныя касы прымалі ўклады і давалі пазыкі толькі членам сельскіх грамад. Толькі ў адной воласці, дзе капітал касы быў вельмі вялікім, выдаваліся пазыкі і чужым асобам, але толькі пад залог працэнтных папер. Парадак дзеянняў кас азначаўся прыгаворамі сходаў. Пазыкі часцей выдаваліся на год з азначасовым пагашэннем. У выніку адбывалася пастаянная перапіска пазыкаў і працэнтаў. Часам сяляне звярталіся да ліхвяроў, каб заняць грошы для пагашэння пазыкі ў касу, а затым пагасіць доўг новай пазыкай [7, с. 475–476].

1 студзеня 1911 г. у 148 валасных пазыка-дапаможных касах Магілёўскай губ. было звыш 1 927,5 тыс. руб. абаротнага капітала (у сярэднім па 13 023,4 руб. у кожнай воласці), а 1 студзеня 1912 г. – 2 068,1 тыс. руб. (па 13 974,0 руб. у воласці). У 1911 г. было выдадзена пазык на 935,8 тыс. руб., вернута – 863,4 тыс. руб. За пазыкі воласці атрымалі прыбытку ад працэнтаў у суме 147,3 тыс. руб. На 1 студзеня 1912 г. у пазыках было звыш 1 717 тыс. руб. [12].

Банкаўскі крэдыт не задавальняў сялян і абстаўляўся значнымі бюракратычнымі абмежаваннямі і ўмовамі, што пужала малапісьменных сялян. Таму пры неабходнасці яны часцей звярталіся да валасных пазыка-дапаможных кас. Аднак капіталы, якія складаліся з выдаткаў усіх сялян воласці, не былі для іх аднолькава даступнымі. Аб'ёмы мірскіх пазыка-ашчадных капіталаў былі вялікімі, але збяднелае сялянства не мела магчымасці імі карыстацца, бо не магло вярнуць іх у тэрмін і з адпаведнымі працэнтамі. Грамада не была зацікаўлена ў страце мірскіх грошай, таму адмаўляла названым катэгорыям насельніцтва ў пазыках. Пазыку атрымлівалі толькі тыя, хто мог яе вярнуць і пагасіць гадавы працэнт, што значна звужала кола тых, хто карыстаўся пазыкамі з названых кас.

Такім чынам, ўрад усклаў абавязкі па сацыяльнай абароне сялянства на само сялянства, і таму, нягледзячы на вялікія выдаткі з боку сельскіх грамад і валасцей, гэтая справа не давала чакаемых вынікаў, аднак тым не менш значна паўплывала на сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускай вёскі. Тым не менш, у цэлым сялянскае самакіраванне праз арганізацыю і дзейнасць пазыка-дапаможных кас спрыяла эканамічнаму развіццю беларускай вёскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ